УДК 94(475)"1920/1930"

# ТАТАРСКАЯ СУПОЛКА г. ДОКШЫЦЫ Ў МІЖВАЕННЫ ЧАС НА ПАДСТАВЕ ГІСТАРЫЧНЫХ КРЫНІЦ І ГІСТАРЫЯГРАФІІ

**Згірскі Ю. І.**
установа адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт»
(Наваполацк, Рэспубліка Беларусь)
Навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук,
дацэнт А. В. Сумко

Анатацыя. У артыкуле разглядаецца татарская суполка г. Докшыцы. Прааналізавана даступная гістарыяграфія, а таксама матэрыялы вуснай гісторыі, сабраныя падчас экспедыцый Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Ключавыя словы: Заходняя Беларусь, вусная гісторыя, Докшыцы, мікрагісторыя, беларускія татары.

Summary. The article presents the Tatar population of the city of Dokshitsy. The available historiography was analyzed, as well as oral history materials collected by expeditions of Polotsk State University.

Keywords: Western Belarus, oral history, Dokshitsy, microhistory, belarusian tatars.

Паводле перапісу насельніцтва Расійскай імперыі 1897 г. колькасць магаметан (мусульман) Еўрапейскай часткі Расійскай імперыі складала 3572617 чал. (10,83%). Згодна з перапісам колькасць мусульман у Докшыцах склада 75 чалавек [6]. Пры ацэнцы колькасці татарскага насельніцтва не былі выкарыстаны перапісы насельніцтва Польшчы 1921 і 1931 гг., бо яны дэманструюць малую колькасць татарскага насельніцтва ў параўнанні з прадстаўнікамі іншых суполак, якія насялялі Докшыцы, што не значна адрозніваецца ад перапісу 1897 г. [7; 8].

З'яўляючыся малаколькаснай, татарская супольнасць г. Докшыцы і ваколіц пераймала элементы культуры карэннага насельніцтва. Адным з такіх элементаў з'яўляецца мова, што тлумачыцца асіміляцыйнымі працэсамі пры дамінаванні іншамоўнага насельніцтва на тэрыторыі даследавання. Яскравым прыкладам моўнай асіміляцыі з'яўляюцца Аль-Кітабы. Зафіксавана існаванне рукапісу, які належыў Хасеню Якубоўскаму (1879-1942 гг.), выконваўшаму абавязкі імама Докшыц. Сам рукапіс датуецца першай паловай XIX ст. («Паўкітаб Палтажыцкага»), асаблівасцю якога з'яўляецца шматмоўе (арабская, турэцкая, польская мовы). Адзначаецца наяўнасць беларускіх моўных норм [5].

Яшчэ адным сведчаннем пранікнення элеменаў мясцовай культуры з'яўляюцца асаблівасці пахаванняў першай паловы XX ст. у мізары г. Докшыцы – уніфікацыя помнікаў з помнікамі прадстаўнікоў іншых рэлігій, што абумоўлена цэнтралізацыяй вырабу помнікаў у межах адпаведных арганізацый, асобамі, якія займаліся вырабам помнікаў (пры гэтым самі па сабе магілы захавалі форму і арыентацыю ў прасторы). Адзначаюцца змены ў дыстанцыянаванасці магіл паміж сабой (татарскія пахаванні ў Докшыцах характарызуюцца кучнасцю размяшчэння паміж сабой, пахаванні пасля 1920-х. гг. паступова страчваюць гэтую асаблівасць). Дамінуючымі мовамі тэкстаў на помніках з'яўляюцца польская, руская, арабская. Апошняе з'яўляецца адлюстраваннем моўнай асіміляцыі. Форма помнікаў можа з'яўляцца прадметам даследавання. Нягледзячы на адсутнасць значных адрозненняў (матэрыял, форма), помнікі з'яўляюцца аднатыпнымі, што падкрэслівае іх на фоне разнастайнасць помнікаў іншых канфесій. Напрыклад, адсутнасць крыжападобных помнікаў (распаўсюджанымі ў 1930-я гг. з'яўляюцца помнікі крыжападобнай формы, вядомыя па польскіх вайсковых могілках, якія распаўсюджаны на тэрыторыі былых усходніх ваяводстваў міжваеннай Польшчы на могілках хрысціянскіх канфесій).

Працягваючы тэму пахаванняў, немагчыма абмінуць месцы матэрыяльнага ўвасаблення веры праз стварэнне аб'ектаў і наданне ім асаблівага статусу і функцый: мізар (могілкі), малітоўны дом [4, с 88]. Наяўнасць падобных аб'ектаў на тэрыторыі Докшыц сведчыць аб існаванні паўнавартаснай мусульманскай абшчыны, фактычна аб існаванні лакальнага цэнтра мусульман Докшыц і ваколіц [7, с. 31].

Узмацненню ролі лакальнага цэнтра мусульман спрыяла стварэнне ў сярэдзіне 1920-х гг. аддзела Культурна-асветніцкага



Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

саюза татараў Польшчы (КАСТП) у Докшыцах [1, с. 253]. На той момант імамам малітоўнага дома з’яўляўся С. Якубоўскі [1, с. 249]. Аддзелы КАСТП займаліся стварэннем і арганізацыяй рэлігійных школ. Паводле А. М. Вабішчэвіча: “Нягледзячы на патрабаванні аб стварэнні асобных дзяржаўных мусульманскіх школ у Вільні І Навагрудку, на працягу ўсяго міжваеннага часу татарскія дзеці вымушаны былі наведваць польскія школы. У адным з лістоў да школьных улад татары Клецка прасілі не караць іх за тое, што не пускаюць сваіх дзяцей да 11 гадоў у польскую школу, бо яны навучаюцца ў рэлігійнай школе” [1, с. 252]. Наяўнасць імама ў Докшыцах робіць магчымым існаванне рэлігійнай школы ў Докшыцах праз існаванне асобы, якая мае магчымасць выконваць функцыі настаўніка.

Акрамя дзейнасці культурнай, татарская суполка вылучалася сваёй роляй у сацыяльна-эканамічных стасунках Докшыц і ваколіц. Дзякуючы матэрыялам экспедыцый Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта існуе магчымасць ахарактарызаваць докшыцкіх татар з пункту гледжання вясковага насельніцтва: “Татары знаеце што, татары выраблялі кожы, вырабляли яны кожы вот татары ўсё врэмя яны. Аўчынкі авяччы вырабляли, там яны і на хром вырабляли і нам татары выраблялі. Авечак жа гадавалі дык даўней жа ж мода кажухі нада было воўну прасці ткаць, шылі ж гэтыя і штаны суконныя шылі, сукно вазілі валіць” [2].

Згодна з наратывам у якасці асноўнага занятку татар вызначаецца апрацоўка скуры і выраб адзення. Рэспандэнтам адзначаны попыт на адзенне, выробленага з воўны і сукна. Задавальненне попыту на прадметы штодзённага жыцця праз традыцыйныя для татар рамёствы можна лічыць адной з асноў існавання і паўнавартаснага функцыянавання ў фактычна чужародным асяроддзі. Па сутнасці, гаворка ідзе пра лакалізацыю ў сацыяльна-эканамічным асяродку з унясеннем ў яго сваіх традыцыйных элементаў, што адлюстроўваецца як у нематэрыяльнай, так і ў матэрыяльнай культурах. Трэба адзначыць, што рэспандэнтам адлюстраваны даваенныя рэаліі. Яскравым прыкладам гэтага з’яўляецца змяненне культурнага і прыроднага ландшафту ў адпаведнасці з рэлігійнымі ўяўленнямі татар: мізар, мячэць (у Докшыцах малітоўны дом). Нягледзячы на функцыянальныя падабенствы з аналагічнымі аб’ектамі хрысціян, мусульманскія аб’екты маюць сваю спецыфіку: асаблівасці пахавальнага абраду і афармленне магілы, афармленне ўнутранай і знешняй прасторы мусульманскага храма. Гаворка ідзе аб змене ландшафту рэлігійнай меншасці на тэрыторыі пражывання суполкі. Існаванне попыту на прадукты вытворчасці татарскай суполкі сведчыць аб даволі мяккай інтэграцыі ў сацыяльна-эканамічныя працэсы Докшыц і ваколіц мястэчка.

Усталяванне і падтрымка сацыяльна-эканамічных сувязей звязана з мясцовым насельніцтвам. Наяўнасць адметнасцей, якія вылучалі татар, не дазваляе сцвярджаць, што яны ўспрымаліся мясцовым насельніцтвам як “свае”. Адрозненне па рэлігійнай прыкмеце адзначаецца ў адным з наратываў, зафіксаваных падчас экспедыцыі Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта: “Не не, яны атдзельнай былі веры” [2].

У матэрыялах вуснай гісторыі фіксуюцца прыклады ўзаемадзеяння мясцовага насельніцтва з татарамі: “Скаціне памагалі. Я чуў у Докшыцах, к татарцы, карова, малако кажаць дужа плахое. То мала дужа, то кроўю доіцца. Дык дась вады скажыць, скажаць што з ёй зробіць” [3].

У наратыве фіксуецца існаванне татаркі-чараўніцы. Вылучэнне адрозненняў (у дадзеным выпадку – па веравызнанні) спрыяла ідэнтыфікацыі татар як “іншых” ці “чужых”. Пры гэтым факт існавання і ўзаемадзеяння з мясцовым насельніцтвам сведчыць аб нейтральных стасунках. У наратыве фігуруе факт дапамогі хатняй жывёле (ідзе гаворка аб буйной хатняй жывёле (карове)), што сведчыць пра ўзаемадзеянне татар з вясковым насельніцтвам.

Аналіз гістарыяграфіі і гістарычных крыніц дазваляе ахарактарызаваць Докшыцы як лакальны цэнтр мусульманскага асяродку, які нягледзячы на паступовае перайманне элементаў культуры карэннага насельніцтва, захаваў сваю самаідэнтычнасць праз мусульманскае веравызнанне. З’яўляючыся лакальным цэнтрам, у Докшыцах існаваў аддзел Культурна-асветніцкага саюзу татар Польшчы, які аб’яднаўваў татар міжваеннай Польшчы, тым самым кансалідуючы апошніх. Малая колькасць татарскага насельніцтва з’яўляецца адным з галоўных матываў уступлення ў шлюб з прадстаўнікамі іншых рэлігій, а менавіта з жанчынамі-інаверкамі, што дазволена ў ісламе (мусульманкам забаронена ўступаць у шлюб з мужчынамі-інаверцамі). Аналіз матэрыялаў вуснай гісторыі дазваляе сцвярджаць, што малакалькасная і інародная па характары этнічная супольнасць мела сваё месца ў сацыяльна-эканамічных стасунках. У наратывах жыхароў ваколіц Докшыц фіксуюцца матэрыялы пра татарак-чарадзеяк, што тлумачыцца існаваннем гэтай катэгоры насельніцтва і характарыстыкай татар як “іншых”, адрозных ад большасці насельніцтва.

**Літаратура**


1. Вабішчэвіч, А. М. Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921-1939 гг.) / А. М. Вабішчэвіч – Брэст : Выд-ва БрДУ, 2008. – 319 с.
2. Запісана ў 2009 г. Лобачам У. А. ад Васілевіч Анастасіі Ігнацьеўны, 1922 года нараджэння ў вёсцы Шалашы Докшыцкага раёна.
3. Запісана ў 2009 г. Высоцкай А., Клопавай С., Філіпенкам У. С ад Працукевічаў Міхаіла Іванавіча (Інф 2), 1925 года нараджэння ў засценку Пішчалёўка і Наталлі Мікалаеўны (Інф 1), 1930 года нараджэння ў вёсцы Рачныя Докшыцкага раёна.
4. Беларусь і цюркска-ісламскі свет: з нагоды 615-годдзя ўзнікнення татарска-мусульманскай супольні на землях ВКЛ: зб. артыкулаў / Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр дасл. беларус. культуры, мовы і літ., філ. «Ін-т мовы і літ. імя Якуба Коласа і Янкі Купалы»; уклад і прадм. І. А. Сынкова, М. У. Тарэлка. – Мінск : Беларус. навука, 2015. – 115 с.
5. Мишкинене, Г. Из археографических находок лета 2002 года [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://etalpykla.lituanistikadb.lt/object/LT-LDB 0001:J.04~2002~1367161931946/. – Дата доступа: 22.02.2022.
6. Первая всеобщая перепись населения Российской империи 1897 года [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.prlib.ru/item/436645. – Дата доступа: 22.02.2022.
7. Skorowidz miejscowości Rzeczypospolitej Polskiej opracowany na podstawie wyników Pierwszego Powszechnego Spisu Ludności z dn. 30 września 1921 r. i innych źródeł urzędowych [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://mbc.cyfrowemazowsze.pl/dlibra/publication/17126?tab=1. – Дата доступа: 22.02.2022.
8. DRUGI POWSZECHNY SPIS LUDNOŚCI Z DN. 9.XII.1931 R. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://statlibr.stat.gov.pl/exlibris/aleph/a22_1/apache_media/VUNVGMLANSCQQFGYHCN3VDLK12A9U5.pdf. – Дата доступа: 02.03.2022.


Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова